НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
Інстытут гісторыі

# ГІСТОРЫЯ ГАНДЛЮ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

*Зборнік навуковых артыкулаў*

Мінск
«Беларуская навука»
2016

УДК 339(476)(091)(082)
ББК 65.42(4Беи)я43
Г51

Укладальнік
А. А. Скеп'ян

Рэдакцыйная калегія:
А. А. Каваленя (старшыня), В. В. Даніловіч, А. А. Скеп'ян (адказны рэдактар), В. Л. Лакіза, В. М. Ляўко, В. Ф. Голубеў

Рэцэнзенты:
доктар гістарычных навук Г. Я. Галенчанка,
доктар гістарычных навук Ю. М. Бохан

*Зборнік падрыхтаваны ў рамках Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2011–2015 гг. «Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава» (навуковыя кіраўнікі праграмы – член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Каваленя, кандыдат гістарычных навук, дацэнт В. В. Даніловіч), а таксама Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2016–2020 гг. «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» (навуковы кіраўнік праграмы – член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Каваленя) падпраграмы «Гісторыя і культура» (навуковы кіраўнік праграмы – кандыдат гістарычных навук, дацэнт В. В. Даніловіч).*

**Гісторыя** гандлю на тэрыторыі Беларусі : зб. навук. арт. / Нац. акад.
Г51 навук Беларусі, Ін-т гісторыі ; уклад.: А. А. Скеп'ян ; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2016. – 503 с.
ISBN 978-985-08-2073-0.

Зборнік прысвечаны розным аспектам развіцця гандлю на тэрыторыі Беларусі з ранняга часу да сённяшняга перыяду, змяшчае артыкулы навукоўцаў, а таксама пашыраныя варыянты дакладаў, якія былі прадстаўлены на навуковай канферэнцыі.

Разлічаны на прафесійных гісторыкаў, выкладчыкаў і ўсіх тых, хто цікавіцца эканамічнай гісторыяй Беларусі.

**УДК 339(476)(091)(082)**
**ББК 65.42(4Беи)я43**

**ISBN 978-985-08-2073-0**

© Інстытут гісторыі НАН Беларусі, 2016
© Афармленне. РУП «Выдавецкі дом «Беларуская навука», 2016

## ЗМЕСТ

Пералік скарачэнняў . . . . . 3

Прывітальнае слова Старшыні Прэзідыума НАН Беларусі, акадэміка Уладзіміра Рыгоравіча Гусакова ўдзельнікам Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Гісторыя гандлю на тэрыторыі Беларусі» . . . . . 5

Прывітальнае слова акадэміка-сакратара Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў, члена-карэспандэнта Аляксандра Аляксандравіча Кавалені ўдзельнікам Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Гісторыя гандлю на тэрыторыі Беларусі» . . . . . 7

*Левко Ольга.* Формирование торговых отношений в Белорусском Подвинье (X–XVIII вв.) . . . . . 10

*Голубеў Валянцін.* Гандаль у Вялікім Княстве Літоўскім у XVI–XVIII стст.: ступень вывучанасці, формы, прынцыпы арганізацыі, асноўныя кірункі ў вывучэнні (пастаноўка праблемы) . . . . . 21

*Казусэк Шимон.* Экономические связи между Беларусью и Королевством Польским в XVI–XVIII вв. Изученность и перспективы исследований . . . . . 32

*Плавінскі Мікалай.* Знаходкі прадметаў узбраення імпартных тыпаў у заходніх землях Русі як магчымы індыкатар гандлёвых кантактаў у X–XIII стст. . . . . . 45

*Бектинеев Шамиль.* Денежные системы X–XIV вв. на территории Беларуси по торговым договорам . . . . . 56

*Иов Олег.* Припятско-Неманская водная магистраль как один из векторов пути «из варяг в греки» . . . . . 79

*Дзярновіч Алег.* «Рускі» двор Рыгі: гандлёвая факторыя беларускіх купцоў XIII–XVI стст. . . . . . 89

*Клімаў Марат.* Некаторыя археалагічныя сведчанні гандлю па р. Заходняя Дзвіна ў XV–XVI стст. . . . . . 100

*Салмина Елена, Салмин Сергей, Подгорная Розалия.* Исследования Нового Торга Пскова XVI–XVIII вв.: археологические открытия и исторические интерпретации . . . . . 112

*Голубеў Валянцін.* Ліст вялікага князя Літоўскага Жыгімонта Аўгуста ад 8 ліпеня 1568 г. аб дзесяцігадовым вызваленні мяшчан г. Лепеля ад усіх відаў мыта падчас гандлю на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага . . . . . 135

*Кобринец Валерий.* «Деньги московские» в кредите и торговле на рынках Могилева в последней четверти XVI – начале XVII в. . . . . . 138



pawet.net

Таким образом, говоря о функционировании припятско-неманского пути в IX – начале XI в., нужно отметить, что с целью экономии сил и времени, возможно, использовались два его варианта: а) из Понеманья в Поднепровье: Неман – Рось – Ясельда – Припять – Днепр; б) из Поднепровья в Понеманье: Днепр – Припять – нижнее течение Ясельды (включая поселение Городище) – небольшие реки в районе Огинского канала – оз. Выгоновское – Щара (через древний Слоним) – Неман. В последнем варианте устранялся фактор встречного течения на большом отрезке пути по Ясельде. К сожалению, сейчас невозможно реконструировать систему рек между оз. Выгоновское и Ясельдой в средневековье. Во второй половине XVIII в. их русла были использованы во время строительства Огинского канала. Только некоторые названия дошли до нас благодаря документам XVI в.: «Отор или Отора» (левый приток Ясельды), Затурница, Тугошаны(а)» (район Телехан и оз. Выгоновского).

**Алег Дзярновіч** *(Мінск)*

## «РУСКІ» ДВОР РЫГІ: ГАНДЛЁВАЯ ФАКТОРЫЯ БЕЛАРУСКІХ КУПЦОЎ XIII–XVI стст.

Нямецкая гандлёвая, царкоўная і палітычная каланізацыя паўднёва-ўсходняга ўзбярэжжа Балтыйскага мора ў канцы XII – XIII ст. прывяла да ўзнікнення Лівонскай канфедэрацыі. У адносінах да паўночна-беларускіх тэрыторый гэтыя палітыка-дзяржаўныя змены спрычыніліся да павелічэння значнасці Дзвінскага гандлёвага шляху – цяпер Дзвіна вяла не толькі на Готланд і ў землі ліваў, некалі падуладных Полацку, а была гандлёвай артэрыяй на шляху да асноўных цэнтраў Ганзы, якая стала адным з найважнейшых эканамічных партнёраў ВКЛ у Паўночнай Еўропе.

Беларускія купцы Падзвіння скіроўваліся пераважна ў Рыгу. Летам, у перыяд навігацыі, зносіны адбываліся па Дзвіне. Зімой жа ехалі на санях. Увесну, падчас паводкі, нагружаныя чаўны сплаўляліся ўніз па галоўнай воднай артэрыі. У Рызе яны зноў нагружаліся і скіроўваліся ўжо ўверх па Дзвіне – да Полацка і Віцебска. Водны шлях быў найбольш танны і зручны.

Дзвінскія караблі мелі і адмысловую назву – стругі, што па-нямецку перадавалася як Strusen. Як яны маглі выглядаць у XIII–XVI стст.? Гэта былі лёгкія судны, якія прыводзіліся ў рух вёсламі, але іх таксама можна было цягнуць вяроўкамі. Мы маем апісанні стругаў толькі з канца XVIII ст. Таксама з канца XVIII ст. выяву стругаў пакінуў нам слынны рыжскі архівіст і краязнаўца Ёган Хрыстаф Броцэ (мал. 1)[1]. Гэта былі шырокія пласкадонныя судны, якія будаваліся старажытным спосабам, на іх выдаткоўвалася шмат лесу. Нагружаныя стругі так глыбока сядзяць у вадзе, што толькі на 1/4 фута ўзвышаюцца

[1] Broce J. K. Zīmējumi un apraksti. 2. sējums Rīgas priekšpilsētas un tuvākā apkārtne. Rīga, 1996. Lp. 81, 17/ II, 105.



Мал. 1. Прыбыццё вясной у Рыгу стругаў з таварамі (Ankuft der Strusen im Frühjahr) (паводле Ё. Х. Броцэ: Sammlung verschiedener Liefländischer Monumente. Vol. 2, T. 2. № 105 (Акадэмічная бібліятэка Латвійскага ўніверсітэта, BM02105A)

над ёй. Зверху над стругамі ўзводзіцца своеасаблівае «скляпенне» (будан) з жэрдак, якое накрываецца рагожамі. Гэтыя судны не маюць ні мачты, ні ветразі, а накіроўваюцца толькі вёсламі і такім чынам нясуцца плынню. Два даўжэзныя вяслы-рулі па абодва канцы судна трымаюць шмат людзей, і вёслы гэтыя служаць не для руху наперад, а для кіравання стругамі. Нямецкі падарожнік Пэтры адзначаў таксама, што гэтыя «дзіўныя судны» перавозяць часам значныя грузы – бываюць стругі, груз якіх ацэньваецца ў 20 000 талераў, большая ж частка з іх мае грузы прыблізна на 8000 – 10 000 талераў.

Ні рыжскія, ні беларускія купцы не былі ўласнікамі стругаў – яны наймалі судны і суднарабочых у полацкіх і віцебскіх суднаўладальнікаў[1]. Купцы звычайна самі суправаджалі свае тавары альбо пасылалі з імі сваіх давераных асоб – прыказчыкаў.

Стругі спыняліся на рачулцы Рыга, якая ўпадала ў Дзвіну. Беларускія купцы часам там жа будавалі з жэрдак і рагожы свае часовыя жытлы, дзе маглі жыць усё лета. Здача тавару, асабліва збожжа і льняных сямян, патрабавала багата часу – іх трэба было ачышчаць. Назад жа частка стругаў ішла таксама гружанай, гэтым разам соллю. Адным з найважнейшых тавараў былі селядцы. Плаванне назад, у Полацк і Віцебск, было досыць складаным, бо ля парогаў і водмелей стругі прыходзілася разгружаць. На адным жа такім судне знаходзіліся 30–40 работнікаў.

[1] Сапунов А. П. Река Западная Двина. Витебск, 1893. С. 282.



Мал. 2. Селядцовы кірмаш на прыстані Рыжскага порта, каля 1650 г.

**«Рускія жыхары» Рыгі.** Варта ўдакладніць паняцце «рускі» ў разуменні немцаў-рыжан у XIII–XV стст. З наяўных крыніц вынікае, што гэты тэрмін мае два тлумачэнні: 1) рэгіянальнае (паходжанне прыезджых купцоў з рэгіёнаў Русі); 2) канфесійнае (асаблівае значэнне ў ліставанні мае царква Св. Міколы ў Рызе). Наколькі пад тэрмінам «рускі» разумеліся ўласнаэтнічныя характарыстыкі, наяўныя крыніцы адказу не даюць.

Прысутнасць у Рызе купцоў з беларускіх падзвінскіх гарадоў і тэрыторый зафіксавана досыць рана. Апроч дзелавой карэспандэнцыі і дагавораў Рыгі з Смаленскам, Полацкам і Віцебскам захавалася яшчэ адна важная крыніца па гісторыі гандлю ў Балтыйскім рэгіёне – Рыжская кніга пазык (Das Rigische Schuldbuch) за перыяд 1286–1352 гг., выдадзеная ў 1872 г. даследчыкам балтыйскіх старажытнасцей Германам Гільдэбрандам (1843–1890)[1]. Даволі хутка пасля публікацыі крыніцы яе аналіз на прадмет удзелу ўсходнеславянскіх купцоў у рыжскім гандлі правёў расійскі даследчык Міхаіл Беражкоў (1850–1932). Рыжская кніга пазык утрымлівае 1909 запісаў, якія амаль выключна датычацца пазык. Колькасць запісаў, звязаных з «рускімі» купцамі, даходзіць да трох соцень і, паводле падлікаў М. Беражкова, дасягае 16 % ад агульнай

[1] Das Rigische Schuldbuch (1286–1352) / hrsg. von Hermann Hildebrand. St. Petersburg, 1872.

колькасці запісаў[1]. Паводле падлікаў Алены Мураўскай, з агульнай колькасці крэдытных запісаў 297, альбо каля 17 %, тычыцца «рускага» гандлю[2]. Рускія купцы выступаюць як пазычальнікамі, так і крэдыторамі, маючы гандлёвыя справы з рыжанамі і паміж сабой.

За перыяд 1286–1352 гг. найбольшая колькасць «рускіх» запісаў (звыш 200) прыпадае на 1286–1295 гг. На працягу ж астатняга 30-годдзя сустракаецца толькі каля 100 падобных запісаў. Трэба адзначыць, што мы не зможам скласці поўную карціну крэдытных здзелак, базуючыся толькі на Рыжскай кнізе пазык. Дамовы крэдытаў і пазык маглі складацца не толькі ў рыжскім магістраце, але і ў прысутнасці некалькіх ратманаў альбо іншых паважаных асоб, якія валодалі ў Рызе нерухомасцю. Апроч таго, страчана некалькі старонак з Рыжскай кнігі пазык, таму мы не можам аднавіць цалкам інфармацыю і за перыяд 1286–1352 гг.

Тым не менш лічба ў 16 % агульнай колькасці запісаў пазык сведчыць пра актыўны ўдзел рускіх купцоў у крэдытным гандлі Рыгі. Застаецца пытанне, ці ўсе рускія купцы ў Рызе былі прыезджымі альбо нейкая іх частка мела статус рэзідэнтаў (жыхароў з маёмасцю) Рыгі? У Рыжскай кнізе пазык рэгулярна сустракаюцца славянскія імёны купцоў з указаннем таго, што яны з'яўляюцца ўладальнікамі нерухомай маёмасці (зямлі і дамоў), якой аперыруюць у якасці закладу ў фінансава-гандлёвых здзелках. Сярод рускіх купцоў мы знаходзім наступныя імёны: Афрэм (Affrem), Дзмітрый (Demitre), Васіль (Wassil), Сямён (Smen), Сымон (Symon), Цімафей Русін (Tymuske Ruthenus), Акакій (Accatie)[3]. Дзмітрый (Dimiter, Demitere, Demytere) названы «русінам і рыжскім грамадзянінам» (Ruthenus et civis Rigensis)[4]. Яхім Русін (Yachim Ruthenus / Yachym Rutho) таксама названы як «грамадзянін (гараджанін) у Рызе» («civis in Riga»)[5]. З іншага боку, у Рыжскай кнізе пазык мы рэгулярна сустракаем згадкі імёнаў іншых купцоў з Русі, як, напрыклад, Якава Бабра з Полацка (Jacowe Bobre de Plotsc)[6]. Праўда, Міхаіл Беражкоў выказваў меркаванне, што з тэксту напрамую не вынікае, ці былі гэтыя купцы гандлёвымі гасцямі Рыгі, ці сталымі яе жыхарамі з пазначэннем месца паходжання[7]. Усё ж гэта ўказанне месца паходжання з гарадоў па Дзвіне накіроўвае на думку, што ў дадзеным выпадку маюцца на ўвазе менавіта прыезджыя купцы.

Таксама варта звярнуць увагу на тое, што некаторыя купцы-русіны Рыгі часта пазычаюць грошы, у тым ліку і нямецкім купцам, як гэта было ў выпадку

[1] Бережков М. Н. О торговле русских с Ригой в XIII и XIV вв. // Журн. М-ва нар. просвещения. 1877. Ч. 189, № 2. С. 350.

[2] Муравская Е. Торговые связи Риги с Полоцком, Витебском и Смоленском в XIII–XIV вв. // Изв. Акад. наук Латв. ССР. 1961. № 2. С. 39.

[3] Das Rigische Schuldbuch. Запісы № 10, 14, 310, 955, 1324, 1340, 1511.

[4] Тамсама. Запісы № 59, 192, 299, 305, 309, 310, 312, 313, 1220, 1224, 1228, 1244–1246, 1707, 1712–1714.

[5] Тамсама. Запісы № 634, 643, 754.

[6] Тамсама. Запісы № 875, 885.

[7] Бережков М. Н. О торговле русских с Ригой... С. 351.

Сцяпана і яго сына Ксенафонта (Steppan et suo filio Cynifonth), якія на працягу 1297–1299 гг. пазычылі Эверарду (Everrardus) вельмі значную суму ў 260 марак срэбра[1]. Таксама пазычаў грошы рускім купцам Кузьма (Cuseman, Cusemanno), але сам ён ніколі не браў пазык[2]. Гэтыя факты дазваляюць разглядаць названых рускіх купцоў як людзей, якія мелі трывалы прававы статус у Рызе, што дазваляла ім праводзіць падобныя фінансавыя аперацыі.

Міхаіл Беражкоў таксама паставіў пытанне, з якіх мясцовасцей маглі паходзіць рускія купцы ў Рызе XIII–XIV стст. Для аналізу гэтай сітуацыі гісторык скарыстаў ускосныя факты. Справа ў тым, што ў 1288 і 1292 гг. у Пскове і Ноўгарадзе былі затрыманы ганзейскія, у тым ліку рыжскія, купцы. У выніку гэта прывяло да спынення гандлёвых сувязяў паміж лівонскімі гарадамі і Псковам і Ноўгарадам. Аднак запісы на працягу дзесяцігоддзя з 1286 па 1295 г. сведчаць, што рускія купцы па-ранейшаму карысталіся ў Рызе найбольшым крэдытам. Відавочна, гэтыя купцы былі найперш палачанамі і віцяблянамі, а таксама смалянамі. Увогуле ж, для Ноўгарада і Пскова Рыга не была найважнейшым рынкам – пскоўская купецка-гарадская карпарацыя падтрымлівала адносіны найперш з Дэрптам (Тарту) і Нарвай, а для Ноўгарада галоўнымі гандлёвымі шляхамі з'яўляліся Волхаў і Нява[3].

Якім чынам рускія купцы знайшлі сабе нішу ў Рызе, варта праілюстраваць на прыкладзе фінансавай актыўнасці Івана Русіна (Johannes Ruthenus) – у запісах паміж 1288 і 1296 гг. яго імя прыгадваецца 50 разоў і складае амаль 1/6 усіх запісаў Рыжскай кнігі пазык адносна русінаў[4]. Іван Русін меў да сарака крэдытораў, і абарот яго крэдыту дасягаў 150 марак срэбра і звыш 100 лісфунтаў[5] воску[6]. Фактычна, як вынікае з запісаў Рыжскай кнігі пазык, Іван Русін і некаторыя прыгаданыя з ім купцы трымалі ў сваіх руках аптовы гандаль воскам, у той час як іншыя рускія купцы былі толькі пасярэднікамі ці пастаўшчыкамі гэтага вельмі выгаднага тавару. Апроч таго, рускія купцы – жыхары Рыгі атрымлівалі права заморскага гандлю, як купец Цімошка, які ў 1327 г. праводзіць аперацыі з Любекам[7].

Застаецца нявысветленым пытанне: ці існавала кампактнае месца пасялення рускіх купцоў у Рызе або яны былі дысперсна расселены па ўсёй гандлёвай Рызе?

**«Рускі двор»: тапаграфія**. Спецыфіка арганізацыі гандлёвых адносін ў Сярэднявеччы прадугледжвала арганізацыю тэрыторый асобага статусу ў галоўных гарадах-партнёрах. Гэта тэндэнцыя прасочваецца з найранейшых перыядаў афармлення падобных зносін. Для Смаленска і цэнтраў Беларускага

[1] Das Rigische Schuldbuch. Запісы № 860.

[2] Тамсама. № 66, 534.

[3] Бережков М. Н. О торговле русских с Ригой... С. 352.

[4] Тамсама. С. 354.

[5] Ніжне-нямецкая, галандская і скандынаўская мера вагі, роўная 16 фунтам; 1 фунт = 434,034 гр (Groth A. Warenumschlag am Frischen Haff. Eine Handelsstatistik der kleinen Seehäfen (1581–1712). Köln; Weimar; Wien, 2009. S. 372).

[6] Das Rigische Schuldbuch. Запісы № 44, 74, 501–504, 507, 533–539.

[7] Тамсама. Запіс № 1511.

Падзвіння афармленне юрыдычнай базы зносін адлічваецца з дагавора 1229 г. смаленскага князя Мсціслава Давыдавіча з Рыгай, Готландам і нямецкімі гарадамі, вядомага нам у трох готландскіх і дзвюх рыжскіх рэдакцыях[1]. З тэксту гэтай дамовы можна зразумець, што ў Смаленску ўжо знаходзіўся лацінскі касцёл Св. Марыі («оу латинское ц(е)ркви»[2]; «...вощный пуд... лежить капь в святий Богородици на горе, а другая в Немечкой Богородици»[3]). Самі ж немцы мелі ў Смаленску «свае двары»: «немецькых дворовъ и дворищь смоленьске коупленины и ц(е)ркве ихъ место»[4].

Не вядома, ці існаваў нямецкі двор у Полацку. У пачатку 1970-х гадоў гэтай праблемай займаўся Герман Гільдэбранд, які адзначаў, што «хоць наконт знешніх зносін полацкай нямецкай калоніі крыніцы кажуць зусім недастаткова, тым не менш можна лічыць несумненным, што кантора ў Полацку не складала, як у Ноўгарадзе, асобнага двара, на якім былі пабудаваны жылыя дамы і свірны і які быў абкружаны валам і ровам, рэзка адмяжоўваючыся ад рускага горада»[5]. Як вынікае з дакументаў, у Полацку нямецкія купцы жылі асобна адзін ад аднаго ў розных дварах і дамах. Таксама 23 лютага 1406 г. вялікім князем Вітаўтам у Полацку праз маршалка Станіслава Чупурна (Czhupurna) быў выдзелены пляц для будаўніцтва лацінскай царквы («bi unsem hausse Ploskow in Russenland»)[6].

Якая ж інфраструктура для полацкіх, віцебскіх і смаленскіх купцоў існавала ў Рызе? Дзякуючы даследаванням латвійскіх археолагаў і гісторыкаў мы можам рэканструяваць тапаграфію размяшчэння «Рускага двара» Рыгі адносна астатняга горада.

Першапачатковы горад Рыга быў заснаваны ў 1201 г. на правым беразе Дзвіны пры ўпадзенні ў яе невялікай ракі Рыга. Таксама трэба адзначыць, да ўзнікнення нямецкай гандлёвай факторыі Рыгі на яе месцы ўжо знаходзілася паселішча тубыльцаў ліваў[7]. Храніст Генрых Латвійскі прыгадвае возера Рыга (lacus Riga)[8]. Менавіта так пазначалася вусце р. Рыга, якое ўтварала вельмі выгадную гавань. Такім чынам, Рыга ад пачатку была важным портам на Балтыцы. Менавіта паміж рэкамі Дзвіна і Рыга і ўзнікла першая абарончая сістэма

[1] Иванов А., Кузнецов А. Смоленско-рижские акты XIII – первой половины XIV в. Документы комплекса Moscowitica-Ruthenica об отношениях Смоленска и Риги. Рига, 2009. С. 215–371.

[2] Смоленские грамоты XIII–XIV вв. / подг. Т. А. Сумникова, В. В. Лопатин; под ред. Р. И. Аванесова. М., 1963. С. 34.

[3] Вішнеўскі А. Ф., Юхо Я. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах (са старажытных часоў да нашых дзён) 2-е выд., дапрац. / пад агул. рэд. А. Ф. Вішнеўскага. Мінск, 2003. С. 22.

[4] Смоленские грамоты XIII–XIV вв. С. 39, 45.

[5] Гильдебранд Г. Немецкий двор в Полоцке // Сб. материалов и статей по истории Прибалтийского края. Рига, 1879. Т. 2. С. 47–48.

[6] Liv-, Esth- und Curländisches Urkundenbuch nebst Regesten. 1394–1413 / hrsg. Friedrich Georg von Bunge. Reval, 1859. S. 520, № 1688.

[7] Caune A. Pētījumi Rīgas arheoloģijā. Rakstu izlase. Rīga, 2007. Lp. 135–153.

[8] Heinrici Chronicon = Indriķa Hronika / Ā. Feldhūna tulkojums; Ē. Mugurēviča priekšvārds un komentāri. Rīga, 1993. Lp. 60.




Мал. 3. Рэканструкцыя тэрыторыі Рыгі і яе ваколіц на 1210 г.: *а* – інтэнсіўная забудова; *б* – разрэджаная забудова (*1* – замак; *2* – гандлёвая прастора перад уездам у горад; *3* – факторыя рускіх купцоў; *4* – мяркуемая факторыя замежных купцоў; *5* – паселішча мясцовага насельніцтва; *6* – узбярэжжа гандлёвага порта; *7* – купецкае паселішча; *8* – паселішча другой паловы XII ст.; *9* – нямецкае купецкае паселішча альбо абоз рыцараў Ордэна; *10* – горад, закладзены ў 1201 г. нямецкімі каланістамі; *11* – прыстань на р. Рыга; *12* – галоўны пракладзены шлях; *13* – шлях да прыстані на р. Дзвіна. (паводле: Zandberga R. Lokāli pilsētbūvnieciskie veidojumi agro viduslaiku Rīgas struktūrā XII un XIII gs. mijā // Latvijas PSR pilsētu arhitektūra. Rīga, 1979. Lp. 71, il. 3)

г. Рыга (мал. 3). Закладзены нямецкімі каланістамі горад з мураванай царквой размяшчаўся менавіта на беразе р. Рыга. На поўдзень ад яго, вышэй па плыні Дзвіны, знаходзіліся купецкія паселішчы. Рыжскі замак размяшчаўся на захад першапачатковага горада, непасрэдна на беразе Дзвіны.

Прастора знаходзілася на паўночным захадзе ад гэтага комплексу і была прызначана для замежных купцоў. Менавіта там, як мяркуецца, узнік «Рускі двор», які меў свой абарончы вал, маштабнасць якога не высветлена. Уся тэрыторыя на паўночны захад ад замка была адведзена пад гандлёвую прастору. Менавіта там перад уездам у горад XIII ст. размяшчалася галоўнае торжышча, а таксама апроч «Рускага двара» знаходзілася мяркуемая факторыя замежных купцоў.

Такім чынам, паводле даследаванняў латышскіх археолагаў і гісторыкаў архітэктуры, першапачаткова «Рускі двор» знаходзіўся па-за межамі гарадскіх умацаванняў Рыгі (горада і замка), але, відавочна, як аўтаномная частка ўваходзіў ва ўрбаністычную сістэму Рыгі XIII ст. Далейшыя ж трансфармацыі структуры Рыгі звязаны з будаўніцтвам новай абарончай сцяны ў канцы XIII – пачатку XIV ст. У гэтых новых урбаністычных рэаліях «Рускі двор» трапляе ўжо непасрэдна на тэрыторыю горада Рыгі і сферу юрысдыкцыі рыжскіх гарадскіх улад (Рыжскай рады). З аўтаномнай структуры месца пасялення беларускіх

купцоў пераўтвараецца ў частку горада і месца кампактнага рассялення купцоў, што прыбывалі з паўночна-ўсходніх тэрыторый Вялікага Княства Літоўскага. Гэты перыяд існавання «Рускага двара» прачытваецца тапанімічна.



Мал. 4. Рыга, вул. Алдару. Адзіны захаваны будынак ад «Рускага двара» (пасля рэстаўрацыі, здымак 2014 г.)

Пад 1345 г. у Рызе прыгадваецца вуліца *platea ruthenorum*, з 1384 па 1584 г. вядома як *de russche strate*. Яшчэ ў пачатку XX ст. невялікі завулак у раёне Ратушнай плошчы меў назву «Руская вуліца». Латышскі археолаг і даследчык старажытнасцей Рыгі Андрыс Цаўнэ лакалізуе старажытную Рускую вуліцу ў раёне сучасных вуліц Ліела Трокшню ці Ліела Алдару (ад латыш. aldaris – півавар)[1]. Менавіта ў раёне гэтых вуліц знаходзіўся апісаны ў рыжскай гарадской дакументацыі ў 1458 г. «Рускі двор» – *russche dorp* з царквой Св. Мікалая, шпіталем-прытулкам і могілкамі. Гэты квартал быў размешчаны з алтарнага боку касцёла Св. Якуба (Екаба), які захаваўся да сённяшніх дзён. Сама ж Мікольская царква была мураванай, мела скляпенні, дах быў крыты дахоўкай. Званы размяшчаліся ў вежы, які мела асобны ўваход. Спецыфіка размяшчэння, гісторыя і архітэктурныя асаблівасці царквы Св. Мікалая ў Рызе былі яшчэ ў 1930-я гады прааналізаваны архітэктарам Паўлсам Кампе[2].

Але тапаніміка з вызначэннем «рускі» сустракаецца і ў раёне Ратушнай плошчы. Мяркуецца, што купцы з усходнеславянскіх рэгіёнаў мелі тут свае гандлёвыя памяшканні. Пра гэта сведчаць назвы дзвюх вуліц, якія прымыкалі да плошчы – «Вялікі Рускі завулак» (пазней – Чарнагаловых) і «Малы Рускі завулак» (яшчэ ў 1930-я гады за ім захоўвалася назва Krievu iela – Руская вуліца)[3].

З афіцыйнай рыжскай дакументацыі (Denkelbok з запісамі за 1440–1480 гг.) вынікае, што на працягу XV ст. адбывалася пашырэнне інфраструктуры «Рускага двара». Пад 1444 г. прыгадваюцца рускія могілкі, побач з якімі зна-

[1] Цауне А. Рига под Ригой: рассказ археолога об исчезнувших постройках древней Риги пер. с латыш. А. Мартинсон. Рига, 1989. С. 42.

[2] Кампе П. Православная церковь св. Николая Чудотворца в гор. Риге // Вера и Жизнь. (Рига). 1938. № 2. С. 174–181; № 3. С. 192–200.

[3] Пухляк О. Русское подворье в Риге // Прибалтийские русские: история в памятниках культуры (1710–2010). Рига, 2010. С. 117.

[х]одзілася царква Св. Мікалая (згадка пад 1453 г.) і канвент (1447 г.)[1] Хутчэй за [у]сё, наўрад ці гэты «канвент» варта разглядаць як манастыр. Яшчэ з XIX ст. Фрыдрых Георг Бунге выказваў меркаванне, а Георгій Трусман[2] пагаджаўся [з] ім, што пад «канвентам» меўся на ўвазе шпіталь-багадзельня – сацыяльная [і]нстытуцыя, дзе аказвалі дапамогу хворым і старым прыхаджанам царквы Св. Міколы, а г. зн. сталым праваслаўным жыхарам Рыгі, а таксама купцам [і] падарожнікам з Беларускага Падзвіння і шырэй – з Усходняй Еўропы.

Прыгадку «рускай гільдыі» дае і 1476 г. Мы не можам даць рэлевантнае [а]пісанне гэтай інстытуцыі і прасачыць, наколькі яна суадносілася з карпарацыямі нямецкіх купцоў. Але, верагодна, можна казаць пра існаванне юрыдычна аформленага аб'яднання рускіх купцоў, якое магло існаваць вакол царквы Св. Мікалая. Ужо ў «Спадчыннай кнізе» (Erbebuch) сустракаецца тэрмін «Руская вёска». Г. Гільдэбранд успрымаў гэты тэрмін у прамым сэнсе і бачыў факторыю рускіх купцоў як асобнае паселішча па-за гарадскімі мурамі перад Пясчанай брамай Рыгі[3].

**Апошні этап існавання**. Фундаментальныя змены ў фактычным становішчы [і] юрыдычным статусе «Рускага двара» адбыліся на працягу XVI ст. Звязана гэта было як з пачаткам Рэфармацыі ў Рызе, так і з геапалітычнымі зменамі [ў] рэгіёне Балтыйскага мора. Рэфармацыйны рух распачаўся ў Рызе ў 1522 г. [з] хваляваннямі на рэлігійнай глебе. Аб'ектамі нападаў сталі не толькі каталіцкія кляштары і храмы, але і царква Св. Мікалая. Аднак на працягу першай паловы XVI ст. архіепіскап Полацкі і Віцебскі ўсё яшчэ накіроўваў святароў для служэння ў праваслаўнай царкве Рыгі, што сведчыць пра актыўнасць жыцця праваслаўнай абшчыны. Усё ж 9 чэрвеня 1548 г. Рыжская рада (рат) часова зачыніла царкву Св. Мікалая. Гэта рашэнне выклікала канфлікт рыжскага патрыцыяту з Рыжскім арцыбіскупам Вільгельмам Брандэнбургскім, які выступаў за захаванне статусу-кво.

У рэчышчы падобнай палітыкі, імкнення ўтрымаць суверэнітэт Лівонскай канфедэрацыі напярэдадні рэгіянальных палітычных катастроф варта разглядаць і зварот ордэнскага магістра Вільгельма фон Фюрстэнберга ў кастрычніку 1557 г. да Рыжскай рады з просьбай выдаць з гарадскога архіва акт дагавора паміж Рыгай і Полацкам, паводле якога і была ўзведзена царква Св. Мікалая.

Сітуацыя з царквой і самім «Рускім дваром» радыкальна змянілася з пачаткам Інфлянцкай вайны ў студзені 1558 г. У першыя гады гандаль па Дзвіне яшчэ адбываўся, пра што сведчыць віцебска-рыжская карэспандэнцыя[4]. Узяцце

[1] Bunge F. G. von. Die Stadt Riga im dreizehnten und vierzehnten Jahrhundert. Geschichte, Verfassung und Rechtzustand. Leipzig, 1878. S. 170.

[2] Трусман Г. Введение христианства в Лифляндии. СПб., 1884. С. 181; Поммер А. А. Русские в Латвии. Исторический очерк. XIII–XIX вв. // Русские в Латвии. Рига, 1933. Вып. 1. С. 17–38.

[3] Hildebrand H. Einleitung // Das Rigische Schuldbuch. S. LXXVII.

[4] Віцебска-Рыжскія акты XIII–XVII стст.: Дагаворы і службовая карэспандэнцыя паміж органамі кіравання горада Віцебска і ганзейскага горада Рыгі (з былога комплекса Ruthenica Дзяржаўнага гістарычнага архіва Латвіі) / падрыхт. Алег Дзярновіч. Мінск, 2005. Вып. I: Дакументы гаспадарча-гандлёвыя, XV–XVI ст. С. 29–39, № 3–6.

маскоўскімі войскамі Полацка ў 1563 г. ускладніла функцыянаванне Дзвінскага гандлёвага шляху. Але ў 1575 г., напрыклад, гандаль паміж Рыгай і Віцебскам адбываўся: з Балтыкі ў беларускі горад пастаўляўся такі важны тавар, як селядцы[1].

Другі этап Лівонскай вайны быў адзначаны наступальнай і паспяховай палітыкай Рэчы Паспалітай. У гэтых умовах Рыга, якая ўсю вайну імкнулася да статусу вольнага імперскага горада Святой Рымскай імперыі, вымушана была ў 1581 г. прысягнуць каралю і вялікаму князю Стафану Баторыю, стаўшы часткай вялікай аб'яднанай дзяржавы Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў.

Але, відаць, як самому дзвінскаму гандлю, так і супольнасці беларускіх купцоў у Рызе гэтай працяглай вайной быў нанесены значны ўдар. 28 жніўня 1582 г. рыжскі бурмістр Мікалай фон Эк распарадзіўся перадаць два званы царквы Св. Мікалая царкве Св. Іаана, якая стала лютэранскай латышскай парафіяй. Усе пабудовы вакол царквы разам са шпіталем перайшлі ва ўладанне рады г. Рыга. У новых палітыка-дзяржаўных умовах гандлёвыя зносіны Рыгі і гарадоў ВКЛ рэгуляваліся ўжо прывілеямі каралёў і вялікіх князёў, а не актамі, якія мелі міжнародны характар. Рудыменты экстэрытарыяльнасці «Рускага двара» гублялі сэнс.

Далейшыя змены рыжскага гандлю звязаны з усталяваннем улады Швецыі над Ліфляндыяй і Рыгай у 1622 г. Пасля Стакгольма Рыга лічылася другім горадам Шведскага каралеўства паводле сваіх маштабаў і стратэгічнай значнасці. Сам горад карыстаўся шырокай аўтаноміяй. Гандаль Рыгі з Расійскай дзяржавай у XVII ст. знаходзіўся ў залежнасці ад меркантыльнай палітыкі шведскага ўрада. Менавіта ў «шведскі перыяд» у Рызе ўзнікае новае кампактнае месца пасялення купцоў з Усходняй Еўропы. Але гэтым разам было створана асобнае гандлёвае падвор'е для пскоўскіх, наўгародскіх і маскоўскіх купцоў. Паводле сталіцы расійскай дзяржавы яно атрымала назву Маскоўскае. У 1642 г. магістрат Рыгі вылучыў для падвор'я (гасцінага двара) расійскіх купцоў асобную тэрыторыю па-за межамі горада[2], яно мела ўласны статут[3]. Але самі пабудовы падвор'я былі ўласнасцю горада, якія арэндаваў рыжскі грамадзянін Юрый Стрыс, альбо Стрыж, як звалі яго расіяне. Інтарэсы расійскага купецтва ў Рызе XVII ст. абаранялі пскоўскія ваяводы.

Тэрытарыяльна Маскоўскае падвор'е знаходзілася на поўдзень ад старажытнага гарадскога ядра Рыгі, у раёне сучаснага Цэнтральнага рынку. Варта нагадаць, што старажытны «Рускі двор» размяшчаўся на супрацьлеглым баку – у паўночна-заходняй частцы Рыгі. Вынесенае за межы горада Маскоўскае падвор'е неаднаразова гарэла, дакладней, яго падпальвалі самі рыжскія ўлады ва ўмовах набліжэння войскаў непрыяцеля, у дадзеным выпадку – расійскіх.

---

[1] Віцебска-Рыжскія акты XIII–XVII ст. С. 40–43, № 7.

[2] Енш Г. Московское торговое подворье в Риге в XVII в. // Вопросы истории. 1947. № 10. С. 74–76.

[3] Енш Г. Московское торговое подворье в Риге в XVII в. С. 79.

Падобным чынам адбывалася ў 1655 і 1700 гг. Але ўзнікненне Маскоўскага падвор'я мела важныя наступствы для развіцця сацыяльна-тапаграфічнай структуры Рыгі. Ва ўмовах сацыяльна-эканамічных супярэчнасцей паміж прывілеяванымі гараджанамі Рыгі ды насельнікамі прадмесцяў менавіта ў прадмесце па-за гарадскімі сценамі сцякаліся новыя жыхары, якія складалі некарпаратыўныя структуры насельніцтва Рыгі. Гэта былі рамеснікі, якія не ўваходзілі ў цэхі, дробныя гандляры, скупшчыкі і падсобныя рабочыя. Вакол Маскоўскага падвор'я на працягу XVIII–XIX стст. утварыўся Маскоўскі фарштат – маскоўскае прадмесце Рыгі, якое засялялі беларусы Віцебскага і Віленскага ваяводстваў і губерній, рускія стараверы, беглыя прыгонныя латышы... Нарэшце ў Маскоўскім фарштаце сфарміравалася свая субкультура і асаблівая гаворка, якая мела выразны адбітак беларускай мовы[1]. Па многіх параметрах свайго развіцця «Рускі двор» і Маскоўскае падвор'е рэпрэзентуюць розныя старонкі гісторыі – храналагічныя, прававыя, этнічныя. Аб'ядноўве іх прыналежнасць да гісторыі гандлю і мадэляў яго рэгулявання.

Падводзячы вынікі сціслага нарыса гісторыі беларускай гандлёвай прысутнасці ў сярэднявечнай Рызе, варта спыніцца на некалькіх важных момантах. Найперш адзначым беларускую прысутнасць у Рызе ад першых гадоў яе існавання. Пад «рускімі» ў дадзеным выпадку разумеліся жыхары гарадоў Беларускага Падзвіння і Смаленска. У сэнсе тапаграфічным перашапачатковае месца пасялення купцоў з Падзвінскага рэгіёна і Смаленска ўяўляла сабой фактарыю – экстэрытарыяльнае пасяленне па-за межамі горада. Верагодна, за гэтым пасяленнем адразу замацавалася назва «Рускі двор». У канцы XIII – пачатку XIV стст. «Рускі двор» стаў інтэгральнай часткай горада – апынуўся ўнутры гарадскіх меж і муроў. Захоўваючы сваю асобнасць і разбудоўваючы ўласную інфраструктуру, «Рускі двор» Рыгі XIV–XVI ст. ужо не з'яўляўся тэрытарыяльна адасобленай часткай горада. Тым не менш прававы статус сталых і часовых жыхароў «Рускага двара» па-ранейшаму рэгуляваўся асобнымі актамі – дагаворамі Рыгі з Полацкам, Віцебскам і Смаленскам і з вялікімі князямі літоўскімі. У «Рускім двары» была створана неабходная духоўна-культурная інфраструктура сярэднявечнай супольнасці – існавала свая царква, шпіталь для сацыяльнай падтрымкі старых і хворых, могілкі. Як рэлігійнае, так і сацыяльнае жыццё «Рускага двара» аб'ядноўвалася вакол царквы Св. Мікалая. «Рускі двор» Рыгі як квартал кампактнага рассялення беларускіх купцоў, якія мелі ў Рызе асобны статус, спыніў сваё існаванне ў другой палове XVI ст. – у выніку Лівонскай вайны і далучэння Рыгі да Рэчы Паспалітай.

---

[1] Гл.: Желтов И. М. О русском говоре в Риге // Рижский старообрядческий сборник: материалы по истории староверия. Рига, 2011. Вып. II. С. 5–43 (рэпублікацыя 1874 г.).